*Таццяна Марозава*

# АРГАНІЗАЦЫЯ ФАЛЬКЛОРНАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ ЗАВОЧНАЙ ФОРМЫ НАВУЧАННЯ І СТУДЭНТАЎ-ПЕРАВОДНІКАЎ У ВУЧЭБНА-НАВУКОВАЙ ЛАБАРАТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ БДУ

Фальклорная практыка студэнтаў філалагічнага факультэта з’яўляецца неад’емнай часткай вучэбнага працэсу пры падрыхтоўцы спецыялістаў-філолагаў па спецыяльнасцях 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія» і 1-21 05 04 «Славянская філалогія», што занатавана ў Агульнаадукацыйным стандарце і Тыпавым вучэбным плане. У Стандарце таксама пазначана, што сярод відаў праходжання фальклорнай практыкі магчыма арганізацыя працы студэнтаў як у архіўных фальклорных фондах пры кафедры, якая ажыццяўляе практыку ў ВНУ, так і па індывідуальных праграмах (што датычыцца замежных студэнтаў). Пры гэтым і для студэнтаў стацыянара, і для студэнтаў-завочнікаў прадугледжаны аднолькавыя патрабаванні як па праходжанні практыкі, так і па падрыхтоўцы выніковай справаздачы. Тым не менш агульнавядома, што студэнты завочнай формы навучання ў большай ступені арыентаваны на самастойнае вывучэнне прадугледжаных праграмай курсаў, у тым ліку і дысцыпліны «Фалькларыстыка», якая знаёміць з тэорыяй і практыкай збірання і вывучэння нацыянальнага фальклору. У параўнанні са студэнтамі стацыянара, студэнты завочнай формы навучання не маюць магчымасці ў практычным ключы пазнаёміцца з асаблівасцямі вызначэння жанраў твораў і паглыбіцца ў тэорыю фальклору праз фальклорны практыкум і прамежкавы залік.

Дадзеная праблема актуальная і для студэнтаў, якія пераводзяцца са стацыянара на завочнае аддзяленне, з іншага ВНУ на стацыянар або завочнае аддзяленне і павінны здаць акадэмічную розніцу па фальклорнай практыцы. Як правіла, такія студэнты ўвогуле могуць быць не знаёмыя з курсам «Фалькларыстыка» (напрыклад, на спецыяльнасці «Рамана-германская філалогія» гэты прадмет не чытаецца – ён не прадугледжаны Стандартам) або праслухалі яго даўно, на 1-м курсе навучання. Такім студэнтам адводзіцца даволі сціслы тэрмін на ліквідацыю дадзенай акадэмічнай розніцы, што значна ўскладняе правядзенне з імі паўнавартаснай практыкі па фальклоры (нагадаем, што па Стандарце гэта 84 гадзіны, або 2 тыдні па 6 гадзін працы).

У сувязі з гэтым арганізацыя і правядзенне фальклорнай практыкі са студэнтамі завочнай формы навучання і студэнтамі-пераводнікамі мае сваю спецыфіку.

1. Выкладчыкі фальклору найперш арыентуюць студэнтаў-завочнікаў на праходжанне фальклорнай практыкі па месцы жыхарства [1] і да заканчэння ўстановачнай сесіі прымаюць ад іх заявы з указаннем канкрэтнага раёна, у якім плануецца збор фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў.

Студэнты, якія па ўважлівых прычынах не маюць магчымасці займацца збіральніцкай дзейнасцю (хворыя бацькі або дзеці, маленькае дзіця, уласная хвароба і інш.), указваюць у заяве месцам праходжання практыкі вучэбна-навуковую лабараторыю беларускага фальклору (далей – ВНЛ БФ). Студэнты, якія пераводзяцца, адразу накіроўваюцца дэканатам на праходжанне практыкі ў ВНЛ БФ.

2. На сённяшні дзень супрацоўнікі ВНЛ БФ карыстаюцца ўласнай методыкай правядзення практыкі па фальклоры са студэнтамі завочнай формы навучання і пераводнікамі. Яна стала вынікам трохгадовага вопыту. Спробы і памылкі дапамаглі нам выявіць і асэнсаваць найбольш плённыя формы работы з названымі студэнтамі. У аснову методыкі пакладзены крытэрый узаемакарыснасці: з аднаго боку, праца студэнтаў у практычным ключы павінна пашырыць іх веды па фальклоры, з другога – яна павінна быць важнай для ВНЛ БФ.

У адпаведнасці з гэтым мы прапануем студэнтам наступныя формы работы.

1. *Тэхнічны электронны набор неабходнай інфармацыі* (напрыклад, інвентарызацыйных ведамасцей паступлення матэрыялаў у лабараторыю; нефарматных картак з фальклорнымі адзінкамі для шафаў жанравага архіва ў праграме «Word»; рэестравых ведамасцей фальклорных матэрыялаў рэгіянальнага архіва ў праграме «Excel»; састарэлых матэрыялаў для рэгіянальнага архіва і інш.). Пры ўсёй сваёй прастаце гэтая форма валодае значным патэнцыялам. Так, з аднаго боку, вырашаецца праблема *рэтраканверсіі* фондаў лабараторыі – перанясення фальклорных твораў з папяровых носьбітаў у электронны фармат, што значна палягчае іх далейшае выкарыстанне. Дзякуючы гэтай працы пачата стварэнне *баз дадзеных жанравага і рэгіянальнага архіваў* лабараторыі. Дзеля арганізацыі дадзенай работы нашы супрацоўнікі ажыццяўляюць прагляд архіўных фондаў, выяўляюць матэрыялы, якія патрабуюць хуткага перанясення ў камп’ютарны варыянт. З другога боку, студэнты атрымліваюць неабходныя веды па варыянтнай прыродзе фальклорных твораў, яны здольныя прасачыць іх стылістычныя і зместавыя асаблівасці (пасля набору 50-ці і больш прыкладаў адной і той жа песні або казкі дадзеныя асаблівасці становяцца бачнымі без аналізу). Яшчэ больш інфармацыі студэнты атрымліваюць пры наборы твораў розных жанраў або справаздач па фальклорнай практыцы канца 60-х – пачатку 70-х гадоў XX ст. Аднак неабходна адзначыць, што набор справаздач як від тэхнічнага набору пакуль што ў стадыі распрацоўкі. Па-першае, далёка не кожны студэнт пагаджаецца на такую аб’ёмную працу, хаця за яе і прапануюцца вышэйшыя балы, паколькі і завочнікі, і пераводнікі маюць абмежаванні па часе праходжання практыкі. Па-другое, тэхнічная база лабараторыі патрабуе свайго ўдасканалення: для стварэнне віртуальнага рэгіянальнага архіва неабходна набыць спецыяльны камп’ютар-сховішча. Дзякуючы намаганням кіраўніцтва факультэта, у рэктарат БДУ пададзена адпаведнае абгрунтаванне на набыццё дадзенага абсталявання. Спадзяемся, што ў 2011 г. пытанне будзе вырашана станоўча, таму што менавіта з 2011 г.

лабараторыя пераходзіць на прыняцце справаздач па фальклорнай практыцы і на стацыянары, і на завочным аддзяленні толькі ў электронным варыянце.

2. *Тэхнічны разбор картак жанравага архіва* (напрыклад, размеркаванне картак пэўнага жанру па адпаведных скрынях у шафах, адбор варыянтаў аднаго і таго ж твора, улік рэгіянальнага распаўсюджання варыянтаў аднаго твора і інш.). Пры выкарыстанні гэтай формы работы са студэнтамі-завочнікамі і пераводнікамі прафесійна апрацоўваюцца матэрыялы пэўнага віду і жанру на аснове прынятых у лабараторыі крытэрыяў унутрыжанравай класіфікацыі фальклорных твораў. Напрыклад, увесь масіў тэкстаў валачобных песень правяраецца на наяўнасць правільнага вызначэння жанру. Пасля гэтага студэнтам прапаноўваецца разбор картак згодна з функцыянальным прынцыпам і г. д. На жаль, папярэдні вопыт працы са студэнтамі ў жанравым архіве паказаў, што спроба самастойнай навуковай апрацоўкі фальклорных адзінак блытае і без таго да канца не ўпарадкаванае размеркаванне картак у шафах. У сувязі з гэтым самастойна студэнты могуць ажыццяўляць менавіта тэхнічныя формы работы, пералічаныя вышэй. Але і тут мы арыентуем студэнтаў на пошукавы характар работы: прапануем ім весці адбор твораў па самым простым (тэматычным) прынцыпе, што робіць іх дзейнасць асэнсаванай, патрабуе больш уважлівага прачытання твора.

На сённяшні дзень супрацоўнікі лабараторыі маюць на ўвазе і такую форму работы са студэнтамі-завочнікамі, як папярэдняя падрыхтоўка фальклорных запісаў да выдання. Яна будзе спалучаць электронны набор з тэматычнай класіфікцыяй і, такім чынам, грунтавацца на працы з тэкстам.

Як правіла, усе названыя формы работы па просьбе саміх студэнтаў ажыццяўляюцца на даму. Пры гэтым кожны студэнт афармляе распіску на імя загадчыка лабараторыі з указаннем колькасці ўзятых на дом матэрыялаў, формы работы з імі і тэрміну звароту. Часам сама работа рэалізуецца ўжо пасля выстаўлення адзнак (аб’ектыўна гэта звязана з кароткім тэрмінам ліквідацыі акадэмічнай розніцы ў студэнтаў-пераводнікаў), што ўскладае на супрацоўнікаў лабараторыі дадатковую адказнасць за зварот матэрыялаў. Тым не менш мы імкнемся ісці студэнтам насустрач і толькі ў крайнім выпадку вырашаем пытанні з несумленнымі студэнтамі праз дэканат.

Такім чынам, фальклорная практыка са студэнтамі завочнай формы навучання і студэнтамі-пераводнікамі ў ВНЛ БФ БДУ праводзіцца ў адпаведнасці з выпрацаванай уласнай методыкай, якая арыентавана на пашырэнне ў студэнтаў ведаў пра фальклор і карыснасць іх дзейнасці для лабараторыі, што дазволіла зрабіць нашу сумесную працу плённай.

**ЛІТАРАТУРА**

1. *Марозава, Т.* Фальклорны практыкум як форма падрыхтоўкі студэнтаў-філолагаў да вучэбнай практыкі / Т. Марозава // Фалькларыстычныя даследаванні: кантэкст, тыпалогія, сувязі: зб. артык. Вып. 6 / пад навук. рэд. В. В. Прыемка, Т. А. Марозавай. – Мінск, 2009.